***Л. М. Луц***
Рэспубліка Беларусь, Бабруйск

# ФАЛЬКЛОРНЫ КАМПАНЕНТ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ВНУ ЭКАНАМІЧНАГА ПРОФІЛЮ

Выкладанне беларускай мовы ў ВНУ эканамічнага профілю мае свае адметнасці. Гэта тлумачыцца як агульнай спецыфікай лінгвістычнай падрыхтоўкі аўдыторыі, так і задачамі, што неабходна вырашыць у працэсе засваення новай інфармацыі. Тут нам бачыцца адным з асноўных пытанняў актывізацыя цікавасці студэнтаў да мовы ў самым шырокім сэнсе, развіццё навыкаў нестандартнага мыслення і выпрацоўка ўменне бачыць унутраную форму слова, яго нацыянальную адметнасць. Гэта можа быць дасягнута толькі пры экстралінгвістычным падыходзе да моўных з'яў, пры арыентацыі на культуралагічны, нацыянальна-спецыфічны аспект слова.

Пры выкладанні мовы вельмі важна ўлічваць фальклорны кампанент, у аснове якога стаіць ідэя цеснай узаемасувязі слова і культуры. І тут мы маем справу з выпрацоўкай камунікатыўна-культуралагічнай кампетэнцыі асобы, што з'яўляецца неабходным элементам прафесійнай падрыхтоўкі ў тым ліку і студэнта-эканаміста. Эфектыўным можа быць далучэнне студэнтаў да этнаграфічных суполак, рухаў, звязаных з адраджэннем традыцыйных народных абрадаў, музыкі і спеваў, рамёстваў, святкаваннем паводле спрадвечных звычаяў, вайсковай рэканструкцыяй, краязнаўствам ды аховай гістарычных і прыродных помнікаў, культываваннем і прапагандай традыцыйнай народнай культуры.

Музычныя фэсты, мастацкія выставы, этнаграфічныя і фальклорныя экспедыцыі, навуковыя выданні і канферэнцыі – пералік культурных ініцыятываў можна доўжыць. Вялікі творчы патэнцыял, культурная і сацыяльная актыўнасць аб'ядноўваюць маладых людзей і ў рэчышчы цікаўнасці да фальклору, да свайго, падштурхоўваюць да таго, што беларуская мова становіцца асноўнай і любімай. Таленавітая, адораная моладзь, неабыякавая ды сваіх этнічных традыцый, разбурае манаполію рускай мовы ў сучасным горадзе. Прыкладам можа быць Студэнцкае этнаграфічнае таварыства, Гісторыка-

культурны клуб «Княжыч», які аб'ядноўвае моладзь Полацка і Наваполацка, апантаную беларускай традыцыйнай культурай у разнастайных яе праявах (фальклор, абрадавасць, народныя рамёствы). Такіх аб'яднанняў не хапае Бабруйску. Шматгадовы досвед працы паказвае, што аналіз фальклорных асаблівасцяў слова спрыяе павышэнню цікавасці студэнтаў да беларускай мовы, пашырае кругагляд, актывізуе пэўныя кагнітыўныя, ментальныя ўстаноўкі.

Важна і тое, што ўключэнне мастацкіх формаў у сучасную практыку выкладання, далучэнне студэнтаў да працэсу культуратворчасці паводле традыцыйнага канону садзейнічае асучасніванню самога фальклору, прыстасаванню да новых умоў бытавання, чым яму гарантуецца жыццяздольнасць і захаванне. Напрыклад, беларускія казацкія песні захавалі мастацкую выхаваўчую і маральна-этычную накіраванасць: «*– Пасцель я пасцялю, сама я не лягу – // Казак маладзенькі адразу абмане. // Дзяўчынанька дурна пасцельку паслала – // Казак пажартаваў, дзяўчына не ўчула. <...> – Дзяўчына, дзяўчына, на сто рублёў на мыла, // Півам напівайся, мылам намывайся, // Каб краса заіграла, каб матка не пазнала*» [1, с. 221]. Песні зафіксавалі шмат прыкладаў казацкага падману: «*– Бадай ты, казача, // Туды не даехаў, // Як ты мяне кінуў // Людзям на пацеху. // Туды не даехаў, // Назад не вярнуўся, // Як мне, маладзенькай, // Ўвесь свет зацягнуўся*» [2, с. 124]. Беспрынцыповыя і антымаральныя дзеянні здзяйсняюць казакі, схіляючы дзяўчат да ўцёкаў з дому: «*П'юць казакі і гуляюць, // К сабе Касю намаўляюць: // – Едзьма, едзьма, Кася, з намі, // Едзьма з намі, казакамі*» [3, с. 298–299]. Маральна-этычныя нормы, што сцвярджаюцца ў песнях, з'яўляліся асновай духоўнага здароўя, рэгулятарам у сямейных і грамадскіх адносінах: «*А хто дачок маіць, няхай навучаіць – // З паўночы да ночы гуляць не пускаіць*» [1, с. 142]. Разгледжаныя песні адлюстроўваюць спецыфіку сямейнага становішча казака ў цэлым, яго асабістыя ўчынкі і маюць выхаваўчую скіраванасць.

Менавіта фальклор выступае адной з самых дзейсных крыніц для заахвочвання моладзі да беларускамоўнае гаворкі. А арганічнае, натуральнае карыстанне сваёй моваю на глыбінных роўнях актуалізуе арыентацыю на культурную традыцыю, гэта значыць такую тактыку (праграму) паводзін, якая, з аднаго боку, садзейнічае ўразуменню нашай самабытнасці,

непадобнасці да іншых народаў, з другога – гарантуе стабільнасць, устойлівасць, магчымасць захоўваць душэўную раўнавагу, жыццёвы дабрабыт.

### Спіс выкарастаных крыніц

1. Песні сямі вёсак: традыцыйная народная лірыка Міншчыны / уклад. Н. С. Гілевіч. – Мінск: Выш. шк., 1973. – 508 с.

2. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі [і інш.]; уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 488 с. – (Беларуская народная творчасць).

3. Беларускія народныя песні: у 4 т. / запіс Р. Шырмы; рэдкал.: Н. Глебка [і інш.]. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1960. – Т. 2: Жаночая доля, недабраная пара, хрэсьбінныя і сіроцкія; Казацкія, рэкруцкія і салдацкія; Батрацкія і прымацкія, песні няволі і змагання. – 429 с.

***Л. И. Ляшенко***
Украина, Донецк

## РОЛЬ ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ЭТИКИ В ИННОВАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Обеспечение устойчивого экономического роста в условиях современной экономики возможно на основе сочетания новейших инновационных технологий и методов морального ведения бизнеса. Инновационная деятельность предполагает разработку и внедрение научно-технических и технологических разработок, освоение производства и продажи инновационной продукции на основе высоколиквидных технологий с привлечением интеллектуального капитала. Специфика этой деятельности заключается в том, что она представляет собой коммерциализацию научных разработок и достижений. Подобным видом деятельности невозможно заставить заниматься, она слабо поддается регулированию. Это – саморегулирующийся процесс, побудительной причиной которого является стремление к сверхприбыли, а сдерживающим – повышенная степень риска.

Современная практика социально-экономического развития, как правило, демонстрирует отсутствие необходимых финансовых средств в инновационные проекты, если институциональная среда непредсказуема. Неустойчивость н непредсказуемость правил поведения в экономике существенным об-

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by